81.411.3
К 20

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА

УДК – 808.26 – 02 ''14 / 17''

КАПЫЛОЎ ІГАР ЛЯВОНАВІЧ

# ТАПАНІМІЯ БЕЛАРУСКІХ ДЗЕЛАВЫХ ПОМНІКАЎ ХУ – ХУ111 стст.

10.02.01 – беларуская мова

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Віцебскі дзяржаўны
універсітэт
імя П.М. Машэрава
БІБЛІЯТЭКА

Мінск -- 2001

81.411.3
К20

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

*20504253*

**Работа выканана ў аддзеле лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута моваўнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі**

Навуковы кіраўнік -- доктар філалагічных навук прафесар **В. П. Лемцюгова**

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук прафесар **Г. М. Мезенка**

кандыдат філалагічных навук прафесар **В. П. Красней**

**Апаніруючая арганізацыя -- [illegible] дзяржаўны універсітэт**

Абарона адбудзецца 19 лютага 2001 г. на пасяджэнні савета па абароне дысертацый **Д 01.43. 01** у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, тэл. 284-15-94).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтарэферат разасланы "19" студзеня 2001 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый А. А. Лукашанец

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# 1 АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць даследавання.** На сучасным этапе развіцця анамастычнай навукі вылучаюцца два асноўныя напрамкі даследавання тапаніміі – рэгіянальны і глабальны, у межах якіх акрэслілася кола больш прыватнай (канкрэтнай) праблематыкі як на сінхронным, так і на дыяхронным узроўнях. Пры сінхронным вывучэнні тапаніміі ўстанаўліваецца ўзаемасувязь асобных геаграфічных найменняў адно з другім, іх сістэмная арганізацыя. Да такога тыпу даследаванняў адносяцца працы Я.М. Адамовіча, Э.К. Бірыла, Л.М. Грыгор'евай і іншых. У манаграфіі В.П. Лемцюговай "Беларуская айканімія" сінхронны аналіз айконімаў спалучаецца з элементамі дыяхраніі.

Пры дыяхронным аналізе засяроджваецца ўвага на пытаннях узнікнення ўласных назваў у сувязі з грамадска-гістарычнымі з'явамі, што іх спарадзілі, выяўляюцца сацыяльна-лінгвістычныя фактары, дзякуючы якім за дадзеным аб'ектам замацавалася менавіта гэтая, а не іншая назва. Даследаванні такога плана маюць на мэце глыбокае пранікненне ў прыроду тапоніма, усебаковае абгрунтаванне выбару матывацыйнага значэння пры яго стварэнні, экстралінгвістычную абумоўленасць наймення. Першая сур'ёзная спроба паказаць цесную ўзаемасувязь паміж працэсам узнікнення тапоніма і грамадска-гістарычнымі ўмовамі, якія гэтаму працэсу спадарожнічалі, зроблена ў працах В.П. Лемцюговай[1].

Тапанімія старапісьмовых помнікаў яшчэ вывучана недастаткова. Па ўсходнеславянскай тэрыторыі існуюць адзінкавыя даследаванні (працы Н.В. Падольскай, Г.Я. Сімінай, Ю.І. Чайкінай).

Тапанімія беларускіх гістарычных дакументаў яшчэ нікім не вывучалася. А якраз старажытныя помнікі могуць даць выключна важны матэрыял, які немагчыма атрымаць з іншых крыніц і які надзвычай неабходны для вырашэння шматлікіх пытанняў як гістарычнай, так і сучаснай тапанімікі. Па старажытных пісьмовых помніках можна прасачыць пачатковы працэс узнікнення ўласных геаграфічных назваў. Чым больш старажытны храналагічны зрэз адлюстроўваюць першакрыніцы, тым больш дакладную і аб'ектыўную інфармацыю можна атрымаць пра тапонім, яго этымалогію, структуру, зыходнае фанетыка-арфаграфічнае аблічча. Апрача таго, аналіз старажытных тапаасноў, зафіксаваных на пэўнай тэрыторыі, дапамагае ўявіць старажытную лексіку ў больш поўным аб'ёме, прасачыць моўныя і гістарычныя сувязі рэгіёна з іншымі тэрыторыямі, а таксама ўдакладніць пытанні фарміравання дыялектаў.

---

[1] Лемтюгова В. П. Восточнославянская ойконимия апеллятивного происхождения. – Минск: Наука и техника, 1983. – 198 с.; Формирование восточнославянской ойконимии в связи с семантической эволюцией нарицательных названий типов поселений и жилища: Дис. д-ра филолог. наук. – Минск, 1985. – 370 с.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Усё вышэй сказанае адносна актуальнасці, навуковай і практычнай важнасці вывучэння тапаніміі старапісьмовых помнікаў, адсутнасць такога плана прац у беларускай тапаніміцы і абумовілі выбар тэмы дысертацыі.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі.** Дысертацыйнае даследаванне звязана з Дзяржаўнай праграмай фундаментальных даследаванняў "Беларуская мова, яе гісторыя, сучасны стан і сувязь з іншымі славянскімі мовамі (Беларуская мова)".

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыі – паказаць працэс станаўлення беларускай старажытнай тапаніміі на шырокім лінгвагістарычным фоне. Для дасягнення гэтай мэты ставяцца наступныя задачы:

-- сабраць як мага паўней тапанімію вывучаемых гістарычных дакументаў, строга захаваўшы іх арфаграфію;

-- зафіксаваць лексіка-семантычныя, структурна-граматычныя і фанетыка-арфаграфічныя варыянты тапонімаў;

--правесці лінгва-гістарычны аналіз тапонімаў: а) выдзеліць і ахарактарызаваць асноўныя лексіка-семантычныя групы ўтваральных асноў; б) выявіць гістарычныя, культурныя і сацыяльна-эканамічныя фактары, што абумовілі працэс фарміравання тапонімаў і з'яўленне варыянтаў; в) даць пералік і класіфікацыю структурных і словаўтваральных тыпаў; г) прасачыць структурную эвалюцыю ва ўтварэнні тапонімаў, паслядоўнасць змен структурных тыпаў, паказаць віды трансфармацыі;

-- ажыццявіць рэканструкцыю рэліктавай апелятыўнай лексікі і семантыкі на аснове тапаніміі старажытнага перыяду.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ект даследавання -- тапанімія беларускіх дзелавых помнікаў ХУ—ХУ111 стст. Прадмет даследавання – асаблівасці фарміравання, развіцця і функцыянавання тапанімічнай сістэмы ў перыяд ХУ—ХУ111 стст.

**Гіпотэза.** Гістарычны патэнцыял, заключаны ва ўласным геаграфічным імені, праяўляецца ў тым, што яно звязана з разнастайнымі сферамі чалавечай дзейнасці. Эпоха і ўзровень ведаў грамадства накладвае адбітак на тапонім. Зварот да пэўных анамастычных асноў і структурных мадэлей заўсёды гістарычны, а таму прыўнясенне гістарычнага моманту ў тапанімічнае даследаванне з'яўляецца абавязковым.

**Матэрыял даследавання.** Асноўнай крыніцай даследавання паслужылі помнікі старабеларускай дзелавой пісьменнасці, апублікаваныя ў серыі "Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской". Выбар крыніц прадыктаваны некалькімі прычынамі: па-першае, гэтыя помнікі ўтрымліваюць вялікі тапанімічны матэрыял, дакладна датаваны і тэрытарыяльна лакалізаваны; па-другое, дзелавыя дакументы (справаводчыя запісы гарадскіх, земскіх, замкавых і копных судоў, інвентары маёнткаў і іншых уладанняў, дэкрэты сеймаў, уводныя і завяшчальныя лісты, рэвізійныя акты, льготныя, межавыя, міравыя граматы, купчыя і інш.) адлюстроўваюць найбольш аб'ектыўныя формы назваў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Усяго прааналізавана 5012 уласных геаграфічных назваў і 1218 іх варыянтаў.

**Тэрыторыя даследавання.** Тэрытарыяльна ''Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы'' ахопліваюць паўночна-ўсходнюю частку ВКЛ, якая ўключае землі Полацкага, Віцебскага, Мсціслаўскага і часткова Менскага і Смаленскага ваяводстваў паводле тэрытарыяльнага падзелу XV--XVIII стст. Пры гэтым улічваліся ўсе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя змены, якія адбываліся на працягу чатырох стагоддзяў.

**Метады даследавання.** У дысертацыі тапанімія разглядаецца як з'ява дынамічная, абумоўленая лінгвістычнымі і экстралінгвістычнымі фактарамі. Паколькі функцыянаванне наймення ў часе складае асноўны прадмет тапанімікі, дамінуючым у даследаванні з'яўляецца дыяхранічны аспект, а вядучымі метадамі -- апісальны, параўнальна-гістарычны і статыстычны. Пры вызначэнні храналогіі тапанімічных пластоў прымяняўся метад стратыграфіі. Апрача таго, выкарыстоўваліся прыёмы супастаўляльнага метаду, дзе крыніцай супастаўлення з'яўляецца апелятыўнае слова (агульнамоўны ўзровень) і слова ў функцыі тапоніма (анамастычны ўзровень).

**Навуковая навізна.** Упершыню праведзена сістэмнае апісанне тапанімічнага матэрыялу па пісьмовых крыніцах. У выніку дыяхранічнага аналізу тапаніміі на фактычным матэрыяле помнікаў паказаны ўмовы і прычыны трансфармацыі назваў геаграфічных аб'ектаў на працягу XV--XVIII стст. -- этапа выключна важнага ў гісторыі нацыянальнай мовы ў цэлым і тапаніміі ў прыватнасці. Упершыню разгледжаны механізм узнікнення варыянтных найменняў.

**Тэарэтычная і практычная вартасць даследавання.** Выяўленне семантычных груп тапонімаў, устанаўленне адносін паміж гэтымі групамі дазволіла даць поўную карціну семантычнай матывацыі тапаніміі аднаго з этналінгвістычных рэгіёнаў. Распрацаваная методыка вывучэння семантыкі і структуры тапонімаў будзе выкарыстана пры вывучэнні тапаніміі іншых беларускіх старажытных рэгіёнаў, у тым ліку ў супастаўляльным плане.

Геаграфічныя назвы – адзін са слаёў спецыяльнай лексікі, які развіваецца на базе звычайных лексічных сродкаў, а таму старажытны тапанімічны матэрыял можа прадуктыўна выкарыстоўвацца ў гістарычнай лексікалогіі: пры рэканструкцыі страчанай семантыкі лексем, гістарычнай лакалізацыі апелятываў, пры аднаўленні старажытных, невядомых сучаснай мове слоў.

Матэрыял, атрыманы ў працэсе даследавання тапаніміі па старажытных помніках, аналіз механізму варыятыўнасці старажытных найменняў геаграфічных аб'ектаў, строгая навуковая фіксацыя ўсіх форм тапонімаў садзейнічаюць выпрацоўцы адзіных норм іх напісання, скланення, транскрыпцыі і транслітарацыі.

Вывады дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры чытанні мовазнаўчых курсаў (па гістарычнай лексікалогіі і гістарычнай дыялекталогіі), спецсемінараў па анамастыцы, пры складанні нарматыўных тапанімічных даведнікаў, слоўнікаў геаграфічнай тэрміналогіі, у краязнаўчай рабоце.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Даследуемы ў гістарычным аспекце матэрыял дае магчымасць выявіць тапанімічныя пласты рознага паходжання і словаўтваральныя мадэлі, што прыходзілі на змену адна адной у асобныя перыяды, атрымаць больш поўнае ўяўленне пра беларускую тапанімію як адзінае эвалюцыйнае цэлае.

2. Старажытная тапанімія як найбольш аб'ектыўны пласт у параўнанні з больш познімі яе пластамі з'яўляецца надзейнай крыніцай рэканструкцыі апелятыўнай лексікі і семантыкі.

3. Прынцыпы намінацыі геаграфічных аб'ектаў паўночна- ўсходняй тэрыторыі ВКЛ ХУ—ХУ111 стст. адлюстроўваюць этапы сацыяльна-палітычнага і культурна-гаспадарчага развіцця грамадства гэтага перыяду.

4. Тапанімія дзелавых пісьмовых помнікаў ХУ – першай палавіны ХУ11 стст. складвалася ва ўмовах актыўнага ўзаемадзеяння старажытнарускай мовы і жывых народных гаворак, што стала вынікам з'яўлення фанетыка-арфаграфічных варыянтаў тапонімаў.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем. Вывучаны, прааналізаваны і абгрунтаваны асаблівасці паходжання, фарміравання і функцыянавання тапаніміі беларускіх дзелавых помнікаў ХУ—ХУ111 стст. Складзены слоўнік-тапанімікон.

**Апублікаванасць вынікаў.** Тэма дысертацыі раскрыта ў васьмі публікацыях – двух артыкулах і матэрыялах шасці навуковых канферэнцый (усяго 53 машынапісныя старонкі).

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Асноўныя палажэнні дакладваліся на трэцяй міжнароднай навуковай канферэнцыі ''Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства'' (г.Віцебск,1994); навукова-метадычнай канферэнцыі ''Праблемы вывучэння і выкладання рускай мовы ў ВНУ і школах рэспублікі'' (г. Мінск, 1992); на Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі ''Беларуская мова і літаратура: праблемы навучання і вывучэння ў сярэдняй і вышэйшай школе'' (г. Мінск, 1994).

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з пераліку ўмоўных скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (229 адзінак), аднаго дадатка.

Тэкст дысертацыйнага даследавання выкладзены на 109 машынапісных старонках. 8 старонак займае пералік умоўных скарачэнняў, 15 старонак -- спіс выкарыстаных крыніц, 142 старонкі -- дадатак, 3 старонкі – карты, 2 старонкі -- карты-схемы.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца выбар тэмы, вызначаецца ступень яе вывучанасці, фармулююцца мэты і задачы даследавання, асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, адзначаецца

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



актуальнасць тэмы, навуковая навізна, тэарэтычная вартасць і магчымасць практычнага прымянення дысертацыі, указваецца метадычны арсенал і крыніцы даследавання.

У **першай главе** (“**Лексіка-семантычная характарыстыка тапонімаўтваральных асноў**”) праводзіцца аналіз лексічнага складу тапонімаў і іх семантыкі.

У залежнасці ад характару тапаасновы і функцыі тапафармантаў назвы, засведчаныя ў пісьмовых крыніцах, падзяляюцца на дзве лексіка-семантычныя групы: 1. Тапонімы апелятыўнага паходжання (утвораныя шляхам тапанімізацыі агульных імён); 2. Тапонімы анамастычнага паходжання (утвораныя шляхам трансфармацыі аднаго класа імён у другі), якія разглядаюцца ў асобных раздзелах. Прынятая ў рабоце класіфікацыя тапонімаўтваральных асноў увязваецца з прынцыпам даследавання матэрыялу “ад тапоніма да апелятыва або оніма”.

Першы раздзел “***Тапонімы апелятыўнага паходжання***” прысвечаны аналізу ўласных геаграфічных назваў, у аснове якіх ляжыць апелятыўная лексіка. Пры разглядзе назваў гэтай групы асноўная ўвага надаецца пошуку матывавальнай асновы тапонімаў, разгляду іх унутранай формы, семантыкі базавых апелятываў, іх сувязі з называемым аб’ектам, суадносінам паміж матывуючым апелятывам і матываваным тапонімам.

Паводле значэння зыходных апелятыўных лексем тапонімы падзяляюцца на 3 разрады: 1. Тапонімы, матываваныя прыродна-геаграфічнай лексікай; 2. Тапонімы, матываваныя апелятывамі, што абазначалі вынікі дзейнасці чалавека; 3. Тапонімы, утвораныя па сацыяльна-маёмаснай або саслоўнай прыкмеце.

Назвы, у якіх адлюстраваліся фізіка-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, у сістэме тапаніміі паўночна-ўсходніх зямель ВКЛ складаюць адносна невялікую групу (388 найменняў, 7,7 % ад усіх зафіксаваных тапонімаў). Пры гэтым доля прыродна-геаграфічных паняццяў у працэсе фарміравання тапаніміі ХУ1 – ХУ111 стст. змяняецца нязначна: 16 ст. – 8,4 % ад агульнай колькасці тапонімаў, 17 ст. – 9,1 %; 18 ст. – 11, 1 %. Найбольш верагодна, што асноўная частка зафіксаваных у гістарычных крыніцах назваў гэтай групы ўзнікла яшчэ ў глыбокай старажытнасці, у дафеадальную эпоху.

Адно з вядучых месц ва ўтварэнні адапелятыўных тапонімаў займаюць тэрміны, што абазначаюць назвы рэльефу. Найбольш актыўна ў якасці тапаасноў выступаюць апелятывы са значэннем: а) ‘узвышша, узвышанае месца’: *Buhry*, *Веретея*, *Волотовка*, *Horbatka*, *Гряда или Гребень* і інш.; б) ‘балоцістае, нізкае месца’: *Arżava*, *Вязище*, *Галя*, *Zabielie*, *Łomiowiszcze*, *Мшарино*, *Понизовье*, *Ховхло*, *Чистик, Юр* і інш. Значную па колькасці групу (72 назвы) складаюць тапонімы, суадносныя з агульнымі назвамі водных басейнаў і іх частак: *Вотоки*, *Jezioro*, *Животоки*, *Rzeczyca*, *Крынки*, *Лука*, *Struhi*, *Sutoki*, *Czarnorucza* і інш.

Звыш 120 геаграфічных найменняў лексічна звязаны з назвамі расліннасці. Сярод іх вылучаюцца тапонімы, матываваныя: а) агульнымі назвамі лясных

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



**У заключэнні** выкладаюцца асноўныя вывады праведзенага даследавання:

1. Тапанімія беларускіх дзелавых помнікаў XУ—XУ111 стст. уяўляе сабой сістэму комплексаў уласных геаграфічных назваў, звязаных паміж сабой характарам і семантыкай лексічных асноў, абумоўленых рэаліямі сацыяльна-палітычнага і культурна-гаспадарчага развіцця грамадства даследаванага перыяду.

У сваёй большасці лексічныя асновы з'яўляюцца неад'емнай часткай народных гаворак і нацыянальнага іменніка.

Супастаўленне семантычных тыпаў па храналагічных зрэзах дало магчымасць прасачыць развіццё тапанімічнай сістэмы, якая характарызавалася дынамізмам і зменлівасцю, як у якасных, так і ў колькасных адносінах. Сутнасць развіцця тапанімічнай сістэмы ў перыяд XУ—XУ111 стст. зводзіцца да звужэння ўдзельнай вагі ў працэсе тапонімаўтварэння апелятыўнай лексікі (асабліва прыродна-геаграфічнай) і росту назваў, матываваных антрапонімамі, што было абумоўлена інтэнсіўным развіццём прыватнага землеўладання і адпаведна шырокім замацаваннем ў тапаасновах асабовых імён землеўладальнікаў (3, 5, 8).

2. Аналіз паказаў, што старажытная тапанімія з'яўляецца надзейнай крыніцай рэканструкцыі зыходных апелятываў і тэрыторыі іх функцыянавання на датапанімічнай стадыі. Гэтаму садзейнічае некалькі фактараў: 1) раннія формы тапонімаў звычайна выяўляюць больш агульнага з зыходнымі апелятывамі, чым познія формы, апрацаваныя тапанімічнай сістэмай і практыкай ужывання; 2) для ранніх тапонімаў характэрна варыянтнасць, якая нярэдка праясняе этапы працэсу фарміравання ўласных геаграфічных назваў; 3) у помніках назва часта выступае ў кантэксце, які дапамагае расшыфраваць закладзеную ў ёй інфармацыю; 4) у шэрагу выпадкаў помнікі фіксуюць значна большы набор тапонімаў з аднолькавай асновай, чым сучасныя крыніцы, што дае больш поўнае ўяўленне пра геаграфію зыходнага апелятыва (1).

3. Паводле структурнага афармлення тапанімія беларускіх дзелавых помнікаў уяўляе сабой даволі разнародны комплекс. Асноўную частку яго складаюць назвы геаграфічных аб'ектаў, утвораныя пры дапамозе традыцыйных старажытных тапафармантаў *–ов* (*-ев*), *-ово* (*-ево*), - *ова* (*-ева*), *-ин* (*-ын*), *-ино* (*-ыно*), *-ина* (*-ына*), - *овка* (*-евка*), - *инка* (*-ынка*), - *ец, -ица* (*-ыца*), *-щина* (*-щизна*). Разам з тым адзначаецца шматлікі слой назваў, якія знаходзяцца на стадыі няпоўнага структурнага афармлення і служаць базай для далейшых тапанімічных трансфармацый: прыназоўнікава-апісальныя тапонімы, беспрыназоўнікава-апісальныя канструкцыі з даданымі сказамі, генітыўныя тапонімы.

Станаўленне структурна-граматычных тыпаў тапонімаў заключаецца ў працяглым гістарычным працэсе, які суправаджаецца пастаянным павелічэннем колькасці аднаслоўных назваў за кошт субстантывацыі тапанімічных прыметнікаў, эліпсацыі (усячэння родавага наменклатуранага тэрміна), утварэння тапонімаў-кампазітаў, скарачэння колькасці кампанентаў у апісальных тапанімічных канструкцыях. Усе гэтыя працэсы стымулююцца шырокай варыянтнасцю. (2,3, 4, 7).

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


4. Арфаграфічная сістэма дзелавых помнікаў, заснаваная на ўзаемадзеянні фанетычнага і этымалагічна-марфалагічнага прынцыпаў правапісу, стала прычынай неаднастайнага афармлення адных і тых жа геаграфічных назваў і ўзнікнення фанетыка-арфаграфічных варыянтаў тапонімаў (6).

**Асноўныя палажэнні адлюстраваны ў наступных публікацыях:**


1. Капылоў І. Л. Тапонімы з асновамі Морач=, Мерач= // Весці Акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 1996. -- № 1. – С. 124—133.

2. Капылоў І. Л. Беларуская старажытная айканімія з прыналежнымі фармантамі // Весці Акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 1996. -- № 4. – С. 108—118.

3. Лемцюгова В. П., Капылоў І. Л. Беларуская айканімія і білінгвізм // Проблемы изучения и преподавания русского языка в вузах и школах республики: Тез. докл. науч.-метод. конф., 20 – 22 мая 1992 г.: В 2 ч. / Бел. гос. ун-т, Мин. гос. пед. ин-т; Редкол.: А.М. Бордович и др. – Минск, 1992. – Ч. 11. – С. 7 – 9.

4. Капылоў І. Л. Беларуская айканімія ХУ—ХУ111 стст. ва ўмовах паланізацыі // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства: Матэрыялы 111 міжнар. навук. канф., 5 – 7 снеж. 1994 г. / Віцеб. пед. ін-т. – Віцебск, 1994. – С. 112—115.

5. Капылоў І. Л. Метадычны аспект тапаніміі // Беларуская мова і літаратура: Праблемы навучання і вывучэння ў сярэдняй і вышэйшай школе: Матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., лістап. 1994 г.: У 2 ч. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Бел. дзярж. ун-т; Адк. за вып. В. Ю. Дылеўская. – Мінск, 1994. – Ч. 1. – С. 29—31.

6. Капылоў І. Л. Узаемадзеянне фанетыка-арфаграфічных элементаў старажытнарускай мовы і беларускіх народных гаворак ў тапаніміі ХУ—ХУ111 стст. // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства: Матэрыялы 1У міжнар. навук. канф., 22 – 24 крас. 1997 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Віцеб. дзярж. ун-т., Бел. рэсп. фонд фундамент. даследаванняў; Адк. рэд. Г.М. Мезенка. – Віцебск, 1997. – С. 216—221.

7. Капылоў І. Л. Тапанімічная сінанімія (на матэрыяле тапаніміі помнікаў дзелавой пісьменнасці ХУ—ХУ111 стст.) // Мова, літаратура, культура (да 55-годдзя адкрыцця кафедры беларускай мовы і літаратуры БДУ): Матэрыялы міжнар. навук. канф., 22 – 23 верас. 1998 г. : У 2 ч. / Бел. дзярж. ун-т. – Мінск, 1998. – Ч. 2. -- С. 33 – 35.

8. Капылоў І. Л. Прыродна-геаграфічная лексіка ў айканіміі беларускіх дзелавых помнікаў ХУ – ХУ111 стст. // Беларуская мова і мовазнаўства на рубяжы 111 тысячагоддзя: Матэрыялы навук. канф., прысвеч. 70-годдзю Ін-та мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, 2—3 ліст. 1999 г. / Ін-т мовазн. НАН Беларусі, Бел. рэсп. фонд фундамент. даследаванняў. – Мінск, 2000, -- С. 78 – 81.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## РЭЗЮМЭ

**Капылоў Ігар Лявонавіч**

**ТАПАНІМІЯ БЕЛАРУСКІХ ДЗЕЛАВЫХ ПОМНІКАЎ ХУ—ХУ111 стст.**

Ключавыя словы: тапанімія, тапонім, айконім, гідронім, антрапонім, апелятыў, тапонімаўтваральная аснова, матывацыя, тапафармант, рэканструкцыя, тапанімічны сінонім, тапанімічны варыянт, дэрыват, трансфармацыя, грамадска-гістарычныя ўмовы.

У дысертацыі даследуецца тапанімія беларускіх дзелавых помнікаў ХУ-ХУ111 стст. Прадметам даследавання з'яўляюцца асаблівасці фарміравання, развіцця і функцыянавання нацыянальнай тапанімічнай сістэмы перыяду ХУ—ХУ111 стст., этапа выключна важнага ў гісторыі беларускай мовы ў цэлым і тапаніміі ў прыватнасці.

Мэта працы – паказаць працэс станаўлення беларускай старажытнай тапаніміі на шырокім лінгвагістарычным фоне. Паколькі функцыянаванне ўласнага імені ў часе складае асноўны прадмет гістарычнай тапанімікі, дамінуючым у дысертацыі з'яўляецца дыяхранічны аспект, а вядучымі метадамі – апісальны, параўнальна-гістарычны і статыстычны.

У дысертацыі ўпершыню сістэмна апісаны беларускі тапанімічны матэрыял па пісьмовых крыніцах, устаноўлены асноўныя прынцыпы намінацыі геаграфічных аб'ектаў, праведзена класіфікацыя структурных і словаўтваральных тыпаў тапонімаў, прасочаны змены структурных тыпаў і выяўлены прычыны тапанімізацыі апелятыўных сродкаў. Зафіксаваны ўсе віды варыянтаў тапонімаў, праведзена рэканструкцыя рэліктавай апелятыўнай лексікі і семантыкі на аснове тапаніміі старажытнага перыяду.

Пацвярджэннем тэарэтычных палажэнняў, выкладзеных у дысертацыі, служыць слоўнік-тапанімікон старабеларускіх помнікаў дзелавой пісьменнасці ХУ – ХУ111 стст., змешчаны ў дадатку да работы.

Матэрыял дысертацыі будзе карысны пры складанні нарматыўных тапанімічных даведнікаў, слоўнікаў геаграфічнай тэрміналогіі, у краязнаўчай рабоце, пры чытанні спецкурсаў у ВНУ, а таксама паслужыць крыніцай інфармацыі ў працы лінгвістаў, гісторыкаў, географаў, этнографаў, картографаў і археолагаў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## РЕЗЮМЕ

**Копылов Игорь Леонович**

**ТОПОНИМИЯ БЕЛОРУССКИХ ДЕЛОВЫХ ПАМЯТНИКОВ ХУ—ХУ111 вв.**

Ключевые слова: топонимия, топоним, ойконим, гидроним, антропоним, апеллятив, топонимообразующая основа, мотивация, топоформант, реконструкция, топонимический синоним, топонимический вариант, дериват, трансформация, общественно-исторические условия.

В диссертации исследуется топонимия белорусских деловых памятников ХУ—ХУ111 вв. Предметом исследования являются особенности формирования, развития и функционирования топонимической системы периода ХУ—ХУ111 вв., этапа исключительно важного в истории белорусского языка в целом и топонимии в частности.

Цель работы -- показать процесс становления белорусской древней топонимии на широком лингвоисторическом фоне. Поскольку функционирование собственного имени во времени составляет основной предмет исторической топонимики, доминирующим в диссертации является диахронический аспект, а ведущими методами – описательный, сравнительно-исторический и статистический.

В диссертации впервые системно описан белорусский топонимический материал по письменным источникам, установлены основные принципы номинации географических объектов, проведена классификация структурных и словообразовательных типов топонимов, прослежены изменения структурных типов и выяснены причины топонимизации апеллятивных средств. Зафиксированы все виды вариантов топонимов, проведена реконструкция реликтовой апеллятивной лексики и семантики на основе топонимии древнего периода.

Подтверждением теоретических положений, изложенных в диссертации, служит словарь-топонимикон старобелорусских памятников деловой письменности ХУ—ХУ111 вв., прилагаемый к работе.

Материал диссертации будет полезен при составлении нормативных топонимических справочников, словарей географической терминологии, в краеведческой работе, при чтении спецкурсов в вузах, а также послужит источником информации в работе лингвистов, историков, географов, этнографов, картографов и археологов.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

*20504253*




## SUMMARY

**Ihar Kapylou**

**TOPONYMY of BELARUSIAN OFFICIAL WRITTEN LANGUAGE MONUMENTS XVth – XVIIIth CENTURIES**

Key words: toponymy, toponym, oikonym, hydronym, antroponym, appealing word, base of the toponymic formation, motivation, topoformant, reconstruction, toponymic synonym, toponymic variant, derivat, transformation, social-historical circumstances.

The dissertation is devoted to the investigation of Belarusian place names in official written language monuments of the XVth – XVIIIth centuries. The subject of the researh is the specific features of formation, development and functioning of the toponymic system in the XVth – XVIII th centuries, the stage which was exstremely significant in the history of the Belarusian language and toponymy as its part.

The aim of the work is to show the process of the Belarusian ancient toponymy formation against a wide linguistic background.

The functioning of the proper name diachronically is the basic subject of historical toponymy. Therefore, the diachronic aspect dominates in the research, and the major methods of investigation are the following – descriptive, comparative-historical and statistical.

This is the first systematic description of Belarusian toponyms found in written sources. The paper also determines the major nomination principles of geographical objects and classifies structural and derivational toponymic types, considers the changes in the structural variants and defines the causes of the toponymisation process in the appealing words. Besides, all toponymic variants are stated, the reconstruction of the relic appealing lexicon and its semantic is undertaken, with the toponymy of the ancient times being the basis of the research.

The dictionary of ancient Belarusian toponyms, borrowed from the monuments of the official written language serves to confirm the theoretical theses suggested in this dissertation.

We hope that the material of the dissertation can be useful for compiling normative toponymic directories and dictionaries of geographical terminology, for area studies, for reading special courses at universities and colleges. This material and the data of the research can be a good source of information for linguists, historians, geographers, ethnographers, cartographers and archeologists.


